# ПРАКТЫКА АКАЗАЛАСЯ ПЛЁННАЙ

Сустрэліся мы вечарам у апошні перад ад'ездам дзень. Клапатліва упакоуваліся чамаданы, дапісваліся апошнія радкі справаздачы аб практыцы, уносіліся вынікі назіранняу і даследаванняу. Леу Расін прымацавау да стосіка спісанай паперы некалькі завітушак перфаленты.

Стрыманага, крыху сарамлівага Расіна я ужо ведау. Разам чакалі аутобуса на прыпынку, разгаварыліся. Адразу ж зауважалася: юнака захапляе будучая прафесія. Турбуецца, дзе дастаць патрэбную літаратуру для курсавой работы, збіраецца наведаць бібліятэку Акадэміі навук БССР. Яго сябры Мікалай Шаройкін і Леанід Кабрусёу дасціпна жартавалі. Але праз знешнюю весялосць і бесклапотнасць праглядвалі рысы сур'ёзных студэнтау. Вучацца яны на чацвёртым курсе механіка-матэматычнага факультэта Гомельскага дзяржаунага універсітэта. Каб замацаваць атрыманыя веды па курсу ЭВМ, прыехалі на практыку у вылічальны цэнтр БДУ. У сваім універсітэце пакуль што такой магчымасці не маюць.

За паутара месяца патрэбна было навучыцца складаць праграмы, каб яны ішлі на ЭВМ, весці з машынай прафесійны дыялог.

...Цяпер пашанцавала убачыць хлопцау перад ад'ездам. Пытаю, як прайшла практыка, ці справіліся усё зрабіць. І вось што пачуу у адказ.

**Леанід Кабрусёу:** Папрацаваць давялося многа. За паутара месяца засвоілі тое, што разлічана на цэлы семестр. Вывучылі дзве алгарытмічныя мовы, самастойна склалі праграмы і задачы для ЭВМ.

**Мікалай Шаройкін:** У асноуным мы мелі справу з машынай «Мінск-22». Асвоіць жа больш сучасную, «Мінск-32», у нас не было магчымасці і часу. Крыху крыудна, што у нашым універсітэце яшчэ не установлена электронна-вылічальная тэхніка і навучанне ідзе у адрыве ад яе.

**Леу Расін:** У вас ёсць чаму павучыцца, ёсць што пераняць. У студэнцкім вылічальным цэнтры, які створан на базе вылічальнага цэнтра БДУ, студэнты пад кіраунiцтвам выкладчыкау прыцягваюцца да навукова-даследчай і вытворчай работы па актуальнай навуковай і вытворчай тэматыцы.

Апрача заданняу, якія прадугледжваліся практыкай, я з дапамогай ЭВМ атрымау некаторыя даныя для сваёй курсавой работы.

**Зінаіда Сафонава:** Вельмі удзячна выкладчыкам факультэта прыкладной матэматыкі за лекцыі, кансультацыі і практычныя заняткі, што праводзіліся для нас. Мы многаму навучыліся, спасцiглі таямніцы алгарытмічных моу, на якіх можна размауляць з ЭВМ. Ад імя усіх нашых практыкантау шчыра дзякуем работнікам вылічальнага цэнтра БДУ Ларысе Васільеуне Вылегжанінай, Іосіфу Барысавічу Гаурысу, якія зрабілі нашу практыку плённай і карыснай.

...Сапрауды будучыя «машынныя матэматыкі» у нашым універсітэце атрымліваюць належную тэарэтычную і практычную падрыхтоуку. Набірае сілу студэнцкі вылічальны цэнтр. Зараз у ім налічваецца 80 найбольш здольных і працавітых студэнтау.

Начальнік ВЦ БДУ Аляксандр Аляксандравіч Пальцау паказау пухлую папку, у якой знаходзяцца заявы жадаючых працаваць у СВЦ. Побач з работнікамі ВЦ, выкладчыкамі ФПМ студэнты-супрацоунікі СВЦ выконваюць некаторыя гаспадарча - дагаворныя работы або частку іх. падрыхтоуваюць і праграміруюць задачы аутаматызаваных сістэм кіравання.

Л. ПЕТЭРСОН.







**На здымках:** студэнты другога курса хімічнага факультэта ў час лабараторных заняткаў па аналітычнай хіміі.

Фота **Д. Чаховіча.**

## У ГРУПАХ І НА КУРСАХ

● ВЕЧАР ПАЭЗІІ, прысвечаны творчасці Р. Раждзественскага, адбыуся ў студэнтау II курса хімічнага факультэта. Яго арганізатарамі былі супрацоунікі біліятэкі Н. М. Славінская і Т. М. Хількевіч.

● ГУТАРКА АБ ЭТЫЦЫ СТУДЭНТА была праведзена у другой групе I курса юрыдычнага факультэта. У ей прыняла ўдзел дацэнт філфака М. Б. Яфімава. Студэнты закранулі многа цікавых пытанняў: аб культуры паводзін на занятках, у грамадскіх месцах, у сям'і і г. д.

# МОЖАМ БЫЦЬ ЛЕПШЫМІ

Цяпер ва універсітэце прыкладна 58 працэнтау іншагародніх студэнтау забяспечана інтэрнатам. Гэта азначае, што на кожным факультэце застаецца яшчэ шмат юнакоу і дзяучат, якія маюць патрэбу у інтэрнаце. І вось пры такім становішчы некаторыя студэнты, атрымліваючы месца у інтэрнаце, парушаюць грамадскі парадак, утрымліваюць свае пакоі у антысанітарным стане, не маюць пачуцця адказнасці за сацыялістычную маёмасць.

Толькі у сакавіку жыллёва-бытавая камісія прафкома на сваіх пасяджэннях разгледзела тры персанальныя справы: студэнтау ФПМ, якія жывуць у інтэрнаце № 7 у пакоі № 719, студэнтау фізічнага факультэта гэтага ж інтэрната з пакоя № 1117, студэнтак філалагічнага факультэта, якія пражываюць у інтэрнаце № 4, пакой № 306.

Падтрыманне парадку у інтэрнатах—справа не толькі прафкома універсітэта і студэнцкіх саветау інтэрнатау, але і усіх грамадскіх арганізацыі факультэтау, універсітэта, дэканатау.

Адным з лепшых ва універсітэце па арганізацыі узорнага парадку у інтэрнаце стау зараз біялагічны факультэт. І гэта не дзіуна — дэканат, партбюро, камітэт камсамола, прафбюро біялагічнага факультэта удзяляюць вялікую увагу інтэрнату № 4, дзе пражываюць біёлагі, аказваюць істотную дапамогу студсавету, які узначальвае студэнт-біёлаг С. Чайка. Выкладчыкі часта наведваюць інтэрнат, і часам, абмеркаваушы вынікі такіх наведванняу, дэканат прымае рашэнне аб высяленні нядбайных студэнтау.

Усяго толькі паугода назад аб інтэрнаце № 4 гаварылі як аб самым дрэнным ва універсітэце, а зараз усё часцей можна чуць аб ім добрыя водгукі.

Інтэрнат № 5. Зусім нядауна тут справілі наваселле географы і юрысты. На сваіх сходах студэнты выбралі студсаветы. Раней меркаванне аб юрыстах, якія пражываюць у інтэрнатах, было невысокім. Віну за тое, што інтэрнат № 4 быу на апошнім месцы сярод другіх інтэрнатаў універсітэта, часта ускладалі на юрыстау. Многія лічылі, што з прыходам юрыстау у інтэрнат № 5 ён адыдзе на апошняе месца.

Але дзе перасяленне прайшло лепш? На юрыдычным факультэце. Дзе у час апошняй праверкі абкомам прафсаюза быу лепшы стан пакояу? Зноу жа у інтэрнаце № 5. Камендант І. Ф. Яшкін задаволен, і студэнты таксама.

У кожным камітэце камсамола факультэта, бюро курса ёсць адказныя за жылбыт. Якую яны вядуць работу? Як узгадняюць свае дзеянні, каб не дубліраваць адзін другога? Прыкладам карыснай садружнасці можа быць вопыт прафкома і камітэта камсамола БДУ. Амаль усе пасяджэнні жыллёва-бытавой камісіі прафкома праходзілі сумесна з камітэтам камсамола. На іх распрацоуваліся сумесныя дзеянні, накіраваныя на паляпшэнне жыллёва-бытавых умоу студэнтау. Чаму ж гэта не практыкаваць на факультэтах?

Цяпер найпершая задача — аформіць да 15 красавіка ленінскія пакоі у інтэрнатах. І гэтым павінны займацца не толькі прафком і студсаветы інтэрнатаў, але і усе грамадскія арганізацыі універсітэта. Мне здаецца, што інтэрнаты універсітэта маюць рэальныя магчымасці заняць прызавыя месцы у рэспубліканскім аглядзе-конкурсе, прысвечаным 50-годдзю утварэння Саюза ССР.

**ВАВІЛАУ,**
**старшыня жыллёва-бытавой камісіі прафкома.**

● *АГЛЯД ДРУКУ*

# ЗНАЙСЦІ ПУНКТ АПОРЫ

Сёння мы пагаворым толькі пра дзве газеты: факультэта журналістыкі і ФПМ.

Многія з вас, мабыць, памятаюць матэрыял, што быу змешчан у нашай газеце пад загалоукам «Журналіст»—газета штотыднёвая». Штотыднёвая газета — гэта нешта новае у нашым насценным друку. Новае і цікавае. На гэта варта звярнуць увагу рэдкалегіям усіх газет. Бо расказваць цікава і падрабязна аб жыцці факультэта кожны тыдзень—ці не ў гэтым задача насценгазет?

Так, задума добрая. Але як жа яна ажыццяуляецца? На журфаку стварылі некалькі рэдакцый на чале з галоўным рэдактарам У. Дальковым. Газета сапраўды стала выходзіць амаль кожны тыдзень. Але бяда ў тым, што агульны яе узровень значна знізіуся. Нярэдка паяуляюцца ў газеце сумныя, проста «адпісачныя» матэрыялы, рубрыкі ж у некаторых нумарах адсутнічаюць зусім. Забылі у «Журналісце» пра пяцікурснікау. А ў іх вось-вось пачнецца абарона дыпломных работ, не так даўно закончылася вытворчая практыка.

Чалі чытаеш «Журналіста», кідаецца ў вочы, што аўтары ў асноўным з II курса. Так, напрыклад, у № 8 газеты з дзесяці змешчаных—6 матэрыялау другакурснікау, амаль тое ж і ў № 13. Толькі тут яшчэ да таго ж і пішуць пра другі курс. У чым справа? Хіба у тым, што у рэдкалегіі ў асноуным студэнты II курса? Здаецца, не толькі ў гэтым, а ў адвечнай нашай праблеме: у насценгазету не хочуць пісаць, мауляу, маштабы не тыя. Аднак у вялікую прэсу студэнтаў-журналістаў пускаюць не надта ахвотна, можа якраз таму, што не набываюць яны майстэрства у сваёй факультэцкай. Вось і прыходзіцца рэдактару не вельмі ўжо перабіраць.

Нядрэнна выглядае на фоне астатніх шосты нумар газеты. У ім шырокі аўтарскі калектыў, шмат цікавых рубрык, такіх, як «Падзеі і мы», «Студэнт у камандзіроуцы», «Ідуць семінарскія заняткі» і інш. Так, нумар ад нумара адрозніваецца, і часта даволі прыкметна. Відавочна, рэдакцыі трэба шукаць нейкі пастаянны пункт апоры, шукаць штодзённа, штогадзінна.

***

Значна лепш у параўнанні з мінулым годам выглядае «Алгарытм» факультэта прыкладной матэматыкі. Можна сказаць, што газета расце і сталее разам з факультэтам. Па-першае, яе вызначае аператыўнасць, па-другое — добрае афармленне. Алгарытмаўцы умеюць ставіць і абмяркоўваць праблемы, не праходзяць міма цікавых з'яў і фактаў студэнцкага жыцця. Не так даўно рэдкалегія правяла сярод студэнтау анкету аб рабоце сталовых. Па выніках свайго даследавання зрабіла цікавы матэрыял і выступіла з ім у шматтыражцы. Думаецца, што такую форму размовы са сваімі чытачамі і аўтарамі пяроймуць рэдкалегіі і іншых газет.

Прыцягваюць увагу рубрыкі, цікавыя загалоўкі ў «Алгарытме»: «Што за пяцёркай?», «Праблемы інтэрната» і іншыя. Нельга сказаць, каб усё было добра, але на сваіх памылках «Алгарытм» вучыцца.

**Л. ДРУЗЕВА.**



Даследаванні па курсавой рабоце праводзіць студэнтка IV курса біяфака Таня **Міцюкова.**
Фота **Д. Чаховіча.**

# ПА СІСТЭМЕ ІЁГАЎ

*● ЗАМЕСТ ФЕЛЬЕТОНА*

Гэтага студэнта я прыкмеціу ужо на першай лекцыі. Ён сядзеу за апошнім сталом у адной і той жа позе і уважліва слухау усё, што я гаварыу. Ні адзінага руху. Увесь — увага! Спачатку мяне крыху здзівіла такая пільнасць. Зрэшты, падумау потым, матэрыял для студэнтау сапрауды новы, выкладаю я яго, здаецца, цікава.

На другой лекцыі я хацеу па гэтаму студэнту кантраляваць свой кантакт з аудыторыяй: шмат лягчэй весці размову, калі бачыш, як цябе успрымаюць. Аказалася, што той самы уважлівы слухач не вядзе ніякіх запісау. Што ж, канспектаванне лекцый — закон для студэнта, хоць кожны з іх працуе і у аудыторыі, і у бібліятэцы, зыходзячы са сваіх схільнасцей, здольнасцей. Пры усім тым, аднак, як сцвярджае вопыт, запісы за выкладчыкам карысныя і неабходныя. Карацей, я страціу усялякі інтарэс да галёркі, дзе сядзеу мой «пільны» студэнт.

І усё ж мяне цягнула да яго як магнітам. Чаму? Што? Мабыць, поза, калі можна так сказаць, — дзелавіта сканцэнтраваная, зацікауленая і разам з тым свабодная. А вочы, вочы? Адкрыты, чысты погляд... Я нават пазайздросціу гэтаму немаладому чалавеку. Якая арганізаванасць, вытрымка! Сапрауды, восем гадзін чалавек адпрацавау за станком на заводзе, а вось прыйдзе ва універсітэт на лекцыі і увесь — увага. Згадзіцеся, дарагія чытачы, такіх студэнтау-вячэрнікау мала.

Аднойчы, гэта было у дзень заканчэння Алімпійскіх гульняу у Сапара, студэнты папрасілі мяне прачытаць лекцыю без перапынку, каб скараціць час і яшчэ паспець паглядзець па тэлевізару передачу з Японіі. Як толькі лекцыя закончылася, усе кінуліся з аудыторыі. У якуюсьці мінуту яна апусцела.

Але што гэта? За апошнім сталом у так спадабаушайся мне дзелавой позе сядзеу студэнт. Так, так, той самы. Адкрыты, чысты погляд. Увесь — увага.

Я падышоу да яго. Ніякай рэакцыі. Як сядзеу, так і сядзіць. Дыханне глыбока і свабоднае.

— Заняткі скончыліся, час дамоу, — злёгку паціскаю яго за плячо.

— А? Што? — схамянууся студэнт, залыпау вачыма і са збянтэжаным відам дадау: — Прабачце, паспау трошкі.

— Як паспау? — стрымліваючы сябе, спакойна спытау я студэнта. — Вы ж так слухалі маю лекцыю. Я за вамі увесь час назірау. Не, не можа быць?

— Можа! — ужо цвёрда адказау студэнт. — Некалькі год трэніравауся, каб навучыцца спаць седзячы і з адкрытымі вачыма.

— Ведаеце, — перайшоу ён на шэпт, — па сістэме іегау.

Чымсьці вельмі вострым кальнула у сэрца. Баючыся, каб не атрымаць другі інфаркт, я павольна апусціуся на крэсла...

**М. РЭГІСТАНАЎ.**

# Спорт ВЫНІКІ ПАДВЕДЗЕНЫ

*Закончыліся спаборніцтвы па зімоваму трохбор'ю на прыз памяці Героя Савецкага Саюза У. Амельянюка. Першае месца у камандным заліку заняу факультэт журналістыкі, другое дасталося ФПМ і трэцяе — матфаку. Слаба выступілі у гэтых спаборніцтвах студэнты фізічнага факультэта, якія аказаліся на сёмым месцы. А гістарычны факультэт і хімічны увогуле не выставілі каманд, што сведчыць аб слабай рабоце спортсектарау камітэтау камсамола гэтых факультэтау.*

*У асаоістым заліку першае месца прысуджана Русаку (ФПМ), другое —Варывончыку (філфак) і трэцяе—Вараб'ёву (ФПМ).*

*В. КРАСНАПРОШЫН.*

# І ЎСЁ Ж ПОСПЕХ

27—29 сакавіка у басейне ІФК адбыліся фінальныя спаборніцтвы па праграме XV Рэспубліканскай спартакіяды СДСТ «Буравеснік», у якіх прыняла удзел і зборная каманда БДУ.

Мы папрасілі трэнера каманды М. Ф. Кузьмянкова адказаць на некаторыя пытанні.

**— Колькі каманд прымала удзел у спаборніцтвах?**

— У фінале былі прадстаулены каманды 14 вну рэспублікі.

**— Раскажыце, калі ласка, аб саміх спаборніцтвах. Як да іх рыхтаваліся плыуцы БДУ?**

— Першынство вну па плаванню праводзіцца кожны год. Сёлета у праграму спаборніцтвау уваходзіла 25 відау. Вядома, што гэта былі самыя адказныя спаборніцтвы сезона, таму усе члены зборнай аднесліся да іх з належнай увагай. Падрыхтоуцы каманды садзейнічалі амаль штодзённыя упартыя трэніроукі, а прыкідкай да фіналу рэспублікі з'явілася наша таварыская сустрэча з плыуцамі Вільнюскага універсітэта.

**— Як выступіла каманда БДУ?**

— Я лічу яе выступленне паспяховым. Але трэба агаварыцца. Першае каманднае месца заняла зборная каманда ІФК. І гэта зразумела само сабой; яна выступіла па-за усякай канкурэнцыяй, і адрыу ад заняушай II месца каманды ГДУ быу 110 ачкоу. Трэцяе месца здабыла зборная МРТІ, вельмі моцная каманда. Многія з яе членау у свой час неаднаразова былі прызёрамі і чэмпіёнамі рэспублікі, з нашай жа каманды толькі Іра Жураулёва уваходзіла у састау зборнай рэспублікі. Каманда БДУ заняла агульнае чацвёртае месца і прынесла спартсменам універсітэта 151 ачко. Я лічу, што гэта значны поспех, бо у мінулым годзе мы былі на восьмым месцы.

**— Якія з вынікау плыуцоу нашай зборнай Вы лічыце патрэбным адзначыць?**

— Перш-наперш трэба адзначыць майстра спорту Іру Жураулёву, якая здабыла другое месца на дыстанцыі 100 метрау вольным стылем. Таццяна Багацька таксама заняла II месца у заплыве на 100 метрау спосабам «дэльфін». III месца на дыстанцыі 200 метрау «дэльфінам» заняу Аляксандр Сямёнау. Услед за камандай ІФК, якая узнавіла рэкорд Белсавета у жаночай эстафеце 4Х100 вольным стылем, другі вынік паказала наша чацвёрка. Іра Жураулёва была чацвёртай на дыстанцыі 400 метрау вольным стылем. Наш мужчынскі квартэт быу пятым у эстафеце 4×100 вольным стылем, а жаночы — чацвёртым у камбінаванай эстафеце.

**— Гэта, вядома, не апошнія спаборніцтвы студэнтау у гэтым навучальным годзе?**

— Вельмі скора адбудзецца першынство універсітэта, і недзе тады ж плыуцы дапамогуць арганізаваць і правесці здачу новых норм ГПА. У самым пачатку мая зборная паедзе у Вільнюс на таварыскую сустрэчу з плыуцамі Вільнюскага універсітэта. Але, вядома, усе гэтыя нагрузкі размеркаваны такім чынам, каб не перашкаджаць вучобе спартсменау і каб наступныя спаборніцтвы не прымусілі іх «плаваць» на экзаменах.

**З. ВАРЫЁНЧЫК,**
студэнт.





**НА ЗДЫМКАХ:** (справа) удзельнікі спаборніцтваў (справа налева) **В. СЯМЁНАЎ, А. АСІПЕНКА** і трэнер зборнай каманды БДУ **М. Ф. КУЗЬМЯНКОЎ;** (унізе на другой ступеньцы п'едэсталу **І. ЖУРАЎЛЁВА.**
Фота **А. Шыраканава.**



**ВЯСЕННІ МАТЫЎ.** Фота **Д. Чаховіча.**

# СТУДЭНЦКІ ГУМАР

*Студэнт выходзіць з аудыторыі. Стомлена выцірае лоб. Яго акружаюць таварышы.*

*— Ну, як, здау?*

*— Здау. Ён мяне тапіу-тапіу, а я выплыу.*

*Калі пра гэтага студэнта спыталі у прафесара, ён сказау:*

*— Ужо цягнуу я яго, цягнуу і выцягнуу.*

*● У СВЕЦЕ ЦІКАВАГА*

# СЁЕ-ТОЕ АБ ХОЛАДЗЕ

● Па гістарычных звестках, у 1485 годзе ў Рускай дзяржаве (маецца на ўвазе цяперашняя Маскоўская вобласць) у студзені і лютым зацвілі сады, але у сакавіку наступілі маразы і усе сады загінулі.

У 1634 годзе ў Германіі у канцы ліпеня выпаў снег, а у 1466 годзе пад Масквой у канцы мая і ў чэрвені снег не раставаў па двое сутак. Зімой у 1928—1929 гадах замерзлі нізоўі Дуная. Чорнае мора поўнасцю замярзала ў 401, 1011 і 1620 гадах. У 1011 годзе было адзначана лёдастаянне нават па ніжняму цячэнню Ніла, а ў 1620 годзе замерзла Міжземнае мора ля Генуі.

● Самым халодным месцам на Зямлі да нядаўняга часу лічыўся г. Верхаянск у Паўночнай Якуціі, дзе маразы дасягаюць мінус 69,8 градуса. Затым больш нізкая тэмпература (—71°) была адзначана у Аймяконі, які знаходзіцца у 700 кіламетрах на паўднёвы ўсход ад Верхаянска. І ўсё ж сапраўдны полюс холаду знаходзіцца у Антарктыдзе.

Савецкія палярнікі на станцыі «Усход» 24 жніўня 1960 года зарэгістравалі ў Антарктыдзе самую нізкую тэмпературу — мінус 88,3 градуса па Цэльсію.

Рэдактар
**А. А. НІКОЛЕНКА.**

Наш адрас: Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106. Тэлефон — 22-07-19.
АТ 02135 Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.
Заказ 419. Тыраж 2 000 экз.